Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!

ДОЖДЖ НА КАЛЯДЫ — ДА ЎРАДЖАЮ 16



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

20 СНЕЖНЯ 2024 г. ПЯТНІЦА № 248 (30382)

# «Аснова, база, людзі для гэтага ёсць»

***На сустрэчы з міністрам інвестыцый ААЭ Прэзідэнт Беларусі гаварыў пра развіццё штучнага інтэлекту*** (стар. 2)



Фота БелТА.

## Шматдзетныя змогуць некалькі разоў скарыстаць маёмасны вылік: якія яшчэ змены адбудуцца ў падатковым заканадаўстве з новага года




# СВОЕЧАСОВА І ПА РАХУНКАХ

**Падатковая сістэма Беларусі павінна быць простай і зразумелай для ўсіх грамадзян. На гэта неаднаразова звяртаў увагу Прэзідэнт. Бо яна — адзін з асноўных элементаў эканамічнай палітыкі краіны. Сёлета ўжо адбыліся змены ў парадак падаткаабкладання. У прыватнасці, адбыліся карэкціроўкі ставкі падаходнага падатку і падатку на прыбытак. Акрамя таго, з 2024 года ўведзены адзіны маёмасны плацеж. У 2025 годзе таксама адбудзецца шэраг змен. Пра самыя значныя — у нашым матэрыяле.**

СТАР. 6

Сацыяльны клопат

# КАБ СВЯТА БЫЛО ВА ЎСІХ

***Акцыя «Нашы дзеці» набірае моц па ўсёй краіне, а на наступным тыдні стартуе акцыя «Ад усёй душы». Абедзве яны праводзяцца па ініцыятыве і пад непасрэдным патранатам Прэзідэнта Беларусі.***

(ПАДРАБЯЗНАСЦІ НА СТАР. 5)



Фота Віктара ДРАЧОВА.

ISSN 1990 — 763X

24248>

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

У НОВЫ ГОД – З ЛЮБІМАЙ ГАЗЕТАЙ

Ідзе падпіска на I квартал і I паўгоддзе 2025 года.

Усім, хто падпісаўся на I квартал або I паўгоддзе 2025 года, у падарунак календары: насценны, рэлігійны, народны і месяцавы.



# «Аснова, база, людзі для гэтага ёсць»

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў ходзе рабочага візіту ў Аб'яднаныя Арабскія Эміраты сустрэўся з міністрам інвестыцый ААЭ, выканаўчым дырэктарам інвестыцыйнага фонду ADQ Махамедам Хасанам Аль-Сувейдзі.

Згадваючы свае мінулыя візіты ў Эміраты, сустрэчы і прэзентацыі на тэму развіцця сферы высокіх тэхналогій, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што поспехі Беларусі ў галіне IT-тэхналогій часткова пачыналіся ў ААЭ: «Я памятаю тую сустрэчу, калі спецыялісты вашы і кітайскія вельмі сур'ёзна акунулі мяне ў гэтую сферу, і мы пачалі задумваца над тым, каб стварыць у Беларусі IT-парк».

> **Адсюль пачыналіся нашы — беларускія — першыя крокі ў асобных сацыяльных сетках, перш за ўсё ў TikTok. Я памятаю, калі вашы спецыялісты (у тым ліку і кітайскія тады) зноў запрасілі мяне на прэзентацыю, дзе шмат расказалі аб развіцці сферы высокіх тэхналогій і вельмі прасілі мяне, каб я пасадзейнічаў развіццю TikTok на тэрыторыі Беларусі», — адзначыў кіраўнік дзяржавы.

Тут жа ў свой час у агульных рысах вялася і размова аб перспектывах штучнага інтэлекту. «Гаварылі аб тым, што гэты, каб яго чорт узяў, штучны інтэлект хутка захопіць увесь свет. І да гэтага я асабіста ставіўся з невялікім даверам. Аказалася, што вашы спецыялісты мелі рацыю», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

«Я абсалютна ўпэўнены, што сённяшняя сустрэча скончыцца нейкім добрым пачынаннем для эканомікі, для людзей Беларусі», — заявіў Прэзідэнт.

> **Тэма маёй цікавасці — штучны інтэлект і яго развіццё. Менавіта развіццё. Не пачатак. Для нас гэта важна, як і для ўсяго свету. І я вам вельмі ўдзячны за тое, што вы з задавальненнем пагадзіліся падзяліцца сваімі ведамі і досведам у развіцці штучнага інтэлекту вашым міністэрствам і вопытам тых спецыялістаў, якія займаюцца гэтай праблемай».**

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што будзе рабіць усё для садзейнічання і развіцця гэтай тэмы ў Беларусі: «Аснова, база, людзі для гэтага ёсць. Вось такая гісторыя сённяшняй сустрэчы. Спадзяюся на будучыню».

У сваю чаргу Міністр інвестыцый ААЭ выказаў упэўненасць, што яго краіна ў бліжэйшыя пяць гадоў зойме лідзіруючыя пазіцыі ў развіцці штучнага інтэлекту.

* * *

**Таксама Прэзідэнт правёў перагаворы з кіраўніцтвам кампаній, якія працуюць у галіне высокіх тэхналогій, уключаючы сферу штучнага інтэлекту.**

## На варце нашай бяспекі

**Сёння адзначаецца Дзень супрацоўніка органаў дзяржаўнай бяспекі. Віншаванне ветэранам і калектыву КДБ накіраваў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

У віншаванні адзначаецца, што з першых дзён стварэння спецслужбы чэкісты знаходзіліся ў авангардзе абароны дзяржавы, адстойваючы яе суверэнітэт і незалежнасць, у барацьбе з ворагам праяўлялі выключную стойкасць, рашучасць і мужнасць, паказваючы прыклад сапраўднага патрыятызму.

Прэзідэнт падкрэсліў, што сённяшнія супрацоўнікі КДБ змагаюцца на схаваным ад вачэй людзей фронце, ва ўмовах новых гібрыдных пагроз нацыянальнай бяспецы, беспрэцэдэнтных па сваім маштабе. А вынікі іх работы садзейнічаюць прыняццю найважнейшых палітычных рашэнняў, шмат у чым вызначаючы будучыню Радзімы, а значыць, і лёсы мільёнаў грамадзян.

Асаблівыя словы падзякі Аляксандр Лукашэнка выказаў ветэранам органаў дзяржаўнай бяспекі і пажадаў ім і ўсяму калектыву КДБ шчасця і дабрабыту, здароўя і аптымізму, новых поспехаў і здзяйсненняў у імя нашай Радзімы.

**Паводле Прэс-службы Прэзідэнта.**

Меркаванні

# Перспектыўны Аравійскі паўвостраў

## Эксперты працягваюць абмяркоўваць блізкаўсходнюю камандзіроўку кіраўніка дзяржавы



**Вадзім ГІГІН**, ***дэпутат Палаты прадстаўнікоў, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (у эфіры «Альфа-радыё»):***

— Аравійскі паўвостраў — вельмі цікавы і перспектыўны для нас рэгіён. У ім шэсць манархій: Саудаўская Аравія, Кувейт, Катар, Бахрэйн, Аб'яднаныя Арабскія Эміраты, Аман. Яны ўваходзяць у Савет супрацоўніцтва арабскіх дзяржаў Персідскага заліва. Паводле ацэнкі Сусветнага банка на пачатак 2024 года, рост ВУП гэтых краін павінен быў складаць па бягучым годзе 3,1 працэнта, па наступным — 3,8 працэнта. Па стане на лістапад яны скарэкціравалі свой прагноз у бок павелічэння, амаль на пункт узнялі.

Гэта вельмі істотна, нават вышэй за агульнасусветныя паказчыкі. Самы вялікі рост будзе ў Саудаўскай Аравіі і Аб'яднаных Арабскіх Эміратах.

Планаванне ёсць ва ўсіх дзяржаў Аравійскага паўвострава. Іх спецыфіка — гэта пераход на ненафтавую эканоміку. Гэта значыць, за кошт нафтавых і газавых грошай імкнуцца сфарміраваць перадавыя ненафтавыя галіны эканомікі, сярод якіх IT, турызм, біятэхналогіі. Паўвостраў з'яўляецца таксама сусветным фінансавым цэнтрам. Толькі ўдумайцеся: трэць усіх фінансавых рэсурсаў ісламскага свету засяроджана цяпер у дзяржавах гэтай шасцёркі, а, можа быць, па выніку гэтага года будзе і больш. Мы ўжо ўзялі планку ў 80 мільёнаў долараў тавараабароту з Арабскімі Эміратамі, плануем выйсці на планку 100 і больш мільёнаў.

А ААЭ ўваходзяць у тройку па інвестыцыйных праграмах у Беларусі. Вось што ўяўляе для нас гэты рэгіён. Нас там чакаюць, трэба працаваць паваротлівей. Там папулярная беларуская адукацыя ў медыцыне, інжынернай сферы, падрыхтоўцы краіназнаўцаў. Ім патрэбны спецыялісты, якія ведаюць наш рэгіён, ведаюць мовы.

Калі казаць пра тое, што даюць візіты Прэзідэнта, успомніце прарыў у Афрыку: толькі за студзень — жнівень рост нашага экспарту павялічыўся ў 4 разы, за 4 гады наш тавараабарот з Кітаем вырас у 2,5 раза. Чакаем чарговага прарыву.

Так званы маршрут Поўнач — Поўдзень для Беларусі вельмі перспектыўны. У час нядаўняга пасяджэння Вышэйшага дзяржсавета ў Мінску, прысвечанага 25-годдзю Саюзнай дзяржавы, ішла размова аб удзеле Беларусі ў развіцці Паўночнага марскога шляху. Дык вось, ад Паўночнага марскога шляху, партоў Ленінградскай вобласці шлях ідзе праз Расію дзякуючы развітой сетцы чыгунак да Азербайджана. Далей Іран, выхад на Персідскі і Армузскі пралівы. Для нас перспектывы вялізныя. Мы зацікаўлены ў тым, каб забяспечыць мірную лагістыку, мірныя гандлёвыя шляхі і тое, што будзе прыносіць нам даход. Дарэчы, краіны Аравійскага паўвострава цікавяцца не толькі эканамічным супрацоўніцтвам, але і культурным.

*Непасрэдна пра нашы адносіны з ААЭ у эфіры СТБ Вадзім Гігін заўважыў:*

— Наша пасольства адкрылася ў Абу-Дабі ў 1999 годзе пры Прэзідэнце Лукашэнку. Дарэчы, выхадзец з гэтага пасольства Раман Аляксандравіч Галоўчанка, цяперашні прэм'ер-міністр. Мы актыўна развіваем адносіны з гэтай краінай, а адтуль як бы выбудоўваем кантакты з усімі краінамі рэгіёна. Гэта вельмі ўдалая схема. Мы так працуем ва ўсіх рэгіёнах. У нас ёсць такія як бы галоўныя пасольствы, кропкі апоры, праз якія мы праводзім нашы нацыянальныя інтарэсы ў тым ці іншым рэгіёне свету.

Яны ніякіх умоў нам не прад'яўляюць, ніякіх прэтэнзій нам не прад'яўляюць. Яны паважаюць незалежнасць і суверэнітэт. І збеглыя ўсе гэтыя ажно шалеюць, чаму на такім узроўні прымаюць. Па-мойму, у снежні мінулага года была афіцыйная заява кіраўніцтва Арабскіх Эміратаў, калі Прэзідэнт Лукашэнка сустракаўся з прэзідэнтам Арабскіх Эміратаў, а ён жа і кіраўнік найбуйнейшага эмірата Абу-Дабі сямейства Аль Нахаянаў. І быў кароткі каментарый арабскага боку: сустрэча прайшла ў сяброўскім і сямейным фармаце. Вось гэта вельмі добрае характарызуе нашы адносіны. За што паважаюць Аляксандра Лукашэнку? За незалежную палітыку, за волю, за рашучасць, за вернасць слову, адказнасць і, безумоўна, устойлівую палітычную сістэму, на якую абапіраецца наш Прэзідэнт. Вось сакрэт поспеху, калі гэта сакрэт.



***Аляксей БЯЛЯЕЎ, дэкан факультэта журналістыкі БДУ, палітолаг (у эфіры «Альфа-радыё»):***

— Беларусь цяпер здзяйсняе ў нечым вымушаны, а ў нечым і прадбачаны нашым Прэзідэнтам і ўжо даўно распачаты разварот на Усход. Узаемаадносіны з дзяржавамі азіяцкага, ціхаакіянскага, афрыканскага рэгіёнаў для нас сёння вельмі важныя, асабліва ўлічваючы недружалюбную палітыку, якая праводзіцца краінамі глабальнага Захаду, еўрапейскімі дзяржавамі, ЗША ў адносінах да нас. Мы маем патрэбу ў дыверсіфікацыі сваіх рынкаў збыту прадукцыі, гандлёвых, лагістычных шляхоў, у дыверсіфікацыі сваіх партнёраў, у тым ліку па тэхналагічных і фінансавых пытаннях.

Аман сёння ўяўляе для нас магчымасць не проста выхаду на рынак адной краіны, але мы можам праз яго распаўсюджваць па ўсім свеце нашы тэхналагічныя, прамысловыя магчымасці. Гэта вельмі выгадная з пункту гледжання геаграфічнага размяшчэння краіна.

Пастаўляючы туды тавары, мы фактычна даможамся таго, што нават сам Аман, выкарыстоўваючы свае магчымасці гандлю і наладжаныя сувязі, зможа нашу прадукцыю — у першую чаргу прамысловых і сельскагаспадарчых прадпрыемстваў — прадаваць далей па ўсім свеце. У гэтым плане мы супрацоўнічаем на ўзаемавыгадным узроўні: Беларусь здае свае тавары і атрымлівае ад гэтага прыбытак. Аман мае навыкі гандлю, шматгадовы вопыт узаемадзеяння з навакольнымі краінамі, таму можа, як кажуць, «прыстроіць» нашы тавары.

Але гэта толькі адна з частак той агульнай карціны супрацоўніцтва. Беларусь можа ў Амане ісці як стваральнік сумесных вытворчасцяў. Мы даём тэхналогіі, будуем у Амане за кошт аманскіх грошай прадпрыемствы, напрыклад, па зборцы беларускай сельскагаспадарчай тэхнікі, забяспечваем яе абслугоўваннем, сваімі патэнтамі, тэхналогіямі. Усходняя дзяржава гэта фінансуе і развівае сваю сельскагаспадарчую галіну, якая патрабуе вельмі вялікіх укладанняў (хто быў у пустынях, той ведае, якая гэта затратная справа — сельская гаспадарка). Тым не менш аманцы спраўляюцца і вырошчваюць пэўныя расліны, якія традыцыйныя для гэтага рэгіёна. І калі фінікавыя пальмы растуць шмат дзе і даюць дастаткова нядрэнны даход, то сёння кіраўніцтва Амана замахнулася на больш глабальныя рэчы: вырошчваць сельскагаспадарчыя збожжавыя культуры, напрыклад пшаніцу, якая патрабуе складанага догляду, паліву, спецыяльнай тэхнікі.

Мы можам рабіць беларускую тэхніку ў Амане і для гэтай краіны, і для распаўсюджвання яе па іншых краінах свету, прычым са зручнай лагістыкай. Напрыклад, гэта будзе выгадна краінам Афрыкі, з якімі мы цяпер завязалі добрыя адносіны, а таксама дзяржавам Паўднёвай Азіі. У гэтым плане для нас Аман дастаткова выгадны і важны. Улічваючы, што ў нас сёння добрыя адносіны, напрыклад, з Іранам, мы можам выкарыстоўваць лагістычнае плячо праз Расію, праз Каспійскае мора пастаўляць тавары ў Іран, праз Персідскі заліў — у Аман, а адтуль — па ўсім свеце.

Усе гандлёвыя маршруты адкрыты. Такі стан спраў выбудоўваўся працяглы час, былі прыкладзены вялікія дыпламатычныя намаганні, у тым ліку асабіста нашым Прэзідэнтам Аляксандрам Лукашэнкам. Гэта вельмі важна, улічваючы, што Беларусь не мае выхаду да мора, бо яе адрэзалі ад Балтыкі. Але ў нас ёсць магчымасці абысці гэтыя перашкоды. Вось у Расіі развіваецца транспарт, будуюцца чыгункі, аўтамабільныя дарогі, а мы працягваем гэты шлях далей, на Усход, працягваем сваю палітыку ўзаемадзеяння з цэлым шэрагам дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі, Афрыканскага кантынента, Аравійскага паўвострава.

Гэта ўсё ў духу, у рэчышчы нашай сучаснай палітыкі пераходу да ўсходняга вектара ўзаемаадносін. І пры гэтым такое развіццё павінна несці прамую выгаду нашай эканоміцы.

Погляд

# СУПРАЦОЎНІЦТВА, ВЫГАДНАЕ АБОДВУМ БАКАМ

**Нядаўні рабочы візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Аман па запрашэнні Султана Амана Хейсама бен Тарыка Аль Саіда па насычанасці і рэзультатыўнасці адназначна можна аднесці да знакавых. Нягледзячы на тое, што прававая база гандлёва-эканамічных адносін Беларусі і Амана была закладзена яшчэ ў 2007 годзе падчас першага візіту беларускага лідара ў гэту краіну, за няпоўныя два дзясяткі гадоў так і не ўдалося іх вывесці на годны ўзровень. У той жа час напрацаваны патэнцыял, з улікам сённяшняй няпростай сітуацыі на глабальным і рэгіянальных узроўнях, стварыў перадумовы для пераасэнсавання і вызначэння новых падыходаў і фарматаў як у рамках двухбаковага супрацоўніцтва, так і каардынацыі сумеснай дзейнасці Амана і Беларусі на міжнароднай арэне.**
**Як сведчаць вынікі мінулага візіту, пастаўленыя мэты былі не толькі дасягнуты, але і па цэлым шэрагу пазіцый нават перасягнулі чаканні.**

Высокія бакі ўзгаднілі тэкст сумеснага камюніке, у якім абодва лідары выказалі сваю рашучасць працаваць разам для дасягнення агульных мэт і пабудовы адносін на аснове ўзаемнай павагі і разумення. Таксама быў адлюстраваны шэраг ключавых кірункаў двухбаковага супрацоўніцтва ў эканамічнай сферы, якія, у сваю чаргу, проста на месцы, былі разгорнуты ў выглядзе партнёрскіх дагавораў і галіновых дарожных карт, з удзелам зацікаўленых бакоў абедзвюх краін.

Ацэньваючы вынікі візіту і далейшыя планы, міністр замежных спраў Беларусі Максім Рыжанкоў адзначыў шэраг прыярытэтных кірункаў і сфер дзейнасці. У прыватнасці, у галіне прамысловай палітыкі, уключаючы стварэнне зборачных вытворчасцяў сучаснай беларускай тэхнікі на тэрыторыі Амана, развіццё новых кампетэнцый з улікам мясцовай спецыфікі і сыравінных рэсурсаў, супрацоўніцтва ў галіне навуковых і інжынірынгавых даследаванняў, падрыхтоўку мясцовых кадраў. На ўзровень канкрэтных дамоўленасцяў і інвестыцыйных праектаў выйшла супрацоўніцтва ў галіне сельскай гаспадаркі і харчовай бяспекі.

З вялікай верагоднасцю вырашана пытанне і стварэння ў свабоднай эканамічнай зоне «Сахар» хаба беларускай прадукцыі для паставак на рынкі краін рэгіёна.

У той жа час не трэба недаацэньваць складанасць у рэалізацыі намечаных амбіцыйных планаў і задач. Аман для айчынных менеджараў на сёння шмат у чым Terra incognita. Нават спецыялісты ЗЭД буйных беларускіх прадпрыемстваў не заўсёды ведаюць, як «уваходзіць» і працаваць на гэтым рынку.

Аман — зусім не маленькая краіна, па плошчы параўнальная з Італіяй або Польшчай. Колькасць насельніцтва па мясцовых мерках таксама не малая — 4,9 млн чалавек. Як і ў большасці краін Блізкага Усходу, тут дастаткова нафты, і каля 40 % ВУП прыносіць нафтагазавы сектар.

Ваганні ў кошце прыродных выкапняў адпаведна ўплываюць на стан эканомікі і ўзровень жыцця ў Амане. Да таго ж запасы нафты ў апошнія гады скарачаюцца, што можа сур'ёзна падарваць фінансавую стабільнасць ужо ў сярэднетэрміновай перспектыве, ставіць пад пагрозу выкананне амбіцыйных планаў кіраўніцтва Амана.

Султан Хейсам бен Тарык, які прыйшоў да ўлады 11 студзеня 2020 года, узяў курс на дыверсіфікацыю эканомікі. Абапіраючыся на праграму Oman Vision 2040, Аман імкнецца скараціць фінансавую залежнасць ад сектара вуглевадародаў шляхам дыверсіфікацыі сваёй эканомікі. Акрамя комплекснага падыходу да павышэння агульнага ўзроўню жыцця і ролі стратэгічнага арыенціра, праграма валодае наймагутнейшым медыяэфектам і стымулам для дзелавой актыўнасці.

Як вынік, Аман, які знаходзіцца сёння на парозе эканамічнага буму, з'яўляецца вельмі прывабнай тэрыторыяй для бізнесу і ўваходу ў рэгіён MENA.

**Згодна з апошнімі дадзенымі, бягучы аб'ём касмічнага сектара рэгіёна складае каля 25 мільярдаў долараў і павінен вырасці ў тры разы да 2032 года.**

## Даведка

**Краіны MENA — гэта геаграфічны рэгіён, які аб'ядноўвае краіны Магрыба і Блізкага Усходу агульнай колькасцю насельніцтва 355 млн чалавек.**

Значную ролю ў стымуляванні інвестыцыйнай актыўнасці Амана адыгрывае нацыянальная банкаўская сістэма, агульныя активы якой на пачатак 2024 года перавысілі $100 млрд, а сукупны аб'ём выдадзеных крэдытаў дасягнуў $80 млрд.

## Даведка

**Мэтавыя паказчыкі эканомікі «Oman Vision-2040» да 2040 года:**

- **дасягненне штогадовага тэмпу росту рэальнага ВУП у 5 %;**
- **падваенне тэмпаў росту рэальнага ВУП на душу насельніцтва;**
- **павелічэнне долі даходаў ад новых сектараў эканомікі да 18 % ад ВУП;**
- **зніжэнне долі нафтавага сектара да 8,4 % ВУП;**
- **павелічэнне долі замежных інвестыцый да 10 % ВУП;**
- **развіццё індустрыі перапрацоўкі сыравіны ўнутры краіны;**
- **павелічэнне ў экспарце краіны долі прадукцыі верхніх перапрацовак.**




**У заключэнні, акрамя названых вышэй, у якасці перспектыўных, але недаацэненых на гэты момант сфер беларуска-аманскага гандлёва-эканамічнага і інвестыцыйнага супрацоўніцтва, можна адзначыць і шэраг іншых:**

- **Альтэрнатыўная, уключаючы ядзерную і вадародную энергетыку, як энергетычную крыніцу будучыні.**
- **Будаўніцтва магутнасцяў па апрасненні і транспарціроўцы прэснай вады.**
- **Сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі, уключаючы тэхналогіі ў сферы кібербяспекі.**

**Султанат Аман мае намер будаваць новую эканоміку з арыентацыяй на лічбавыя тэхналогіі. У сувязі з гэтым Султан Хейсам бен Тарык даў даручэнне свайму ўраду паскорыць іх укараненне з мэтай зрабіць іх аднымі з асноўных інструментаў і каталізатараў для іншых сектараў эканомікі ў сістэме дзяржкіравання.**

- **Новыя матэрыялы, заснаваныя на палімерных тэхналогіях.**
- **Горназдабыўная галіна, уключаючы такія сферы, як геалагаразведка, прагназаванне і ацэнка запасаў карысных выкапняў, экалагічныя аспекты нетракарыстання, рацыянальнае выкарыстанне нетраў.**
- **Сістэма аховы здароўя.**

**У краіне развіваецца дзяржаўная медыцына, бясплатная для насельніцтва. Клінікі паступова забяспечваюцца больш сучасным абсталяваннем, вельмі запатрабаваны сучасныя падыходы да дыягностыкі і тэрапіі.**

- **Космас.**

**Аманская кампанія Etco Space запусціла свой першы спадарожнік Аман-1 у лістападзе 2023 года. Спадарожнік прызначаны для дэманстрацыі магчымасці і наступнага разгортвання больш буйной групоўкі ўжо ў сярэднетэрміновай перспектыве.**

- **Турызм.**

**Аман — краіна прэміяльнага ўзроўню з пункту гледжання выдаткаў, якія чакаюць вас, і адпачынак тут адносіцца да сегмента leisure-luxury. Прывабнасць Амана заключаецца ў тым, што тут захавалася больш чым тысяча старажытных фартоў і іншых фартыфікацыйных збудаванняў, замкаў і старадаўніх рынкаў, якія маюць гістарычную каштоўнасць.**

Як кажуць, планы намечаны, засталося іх увасобіць у жыццё.

**Георгій ГРЫЦ, кандыдат эканамічных навук.**

## Даведка

**Аднайменны глыбакаводны порт і прылеглая да яго СЭЗ «Сахар» знаходзяцца на паўднёвы ўсход ад Армузскага праліва на беразе Аманскага заліва. Порт апрацоўвае больш за 1 млн т марскіх грузаў за тыдзень і каля 3,5 тыс. суднаў за год. З моманту стварэння СЭЗ «Сахар» прыцягнула інвестыцый на суму больш як $26 млрд і стала адной з найбольш дынамічных і пасьпяховых прамысловых зон рэгіёна заліва. На тэрыторыі СЭЗ размешчаны прадпрыемствы нафтахімічнай і лагістычнай галіны, па вытворчасці пластмас, металургіі, здабычы карысных выкапняў, харчовай і аўтамабільнай прамысловасці. У ліку пераваг зоны — зручная лагістыка, адсутнасць імпартных пошлін і пошлін на рээкспарт, вызваленне ад падаткаў на прыбытак арганізацый да 25 гадоў і адсутнасць асабістага падаходнага падатку. Выпрабленая прадукцыя карыстаецца шэрагам ільгот у рамках міждзяржаўных пагадненняў Амана. Чакаецца, што порт возьме на сябе адказнасць за кіраванне Аманскім нацыянальным харчовым рэзервам.**

На кантролі

# Сістэмных праблем няма

## З удзелам Наталлі КАЧАНАВАЙ абмяркавалі меры, якія прымаюцца па развіцці аховы здароўя ў сталіцы

**Асаблівая ўвага на пасяджэнні Мінгарвыканкама была ўдзелена паляпшэнню дэмаграфічнай сітуацыі. Нягледзячы на тое, што на працягу апошніх гадоў у Мінску павялічылася даступнасць якасных медыцынскіх паслуг, адзначаецца нізкі ўзровень дзіцячай смяротнасці, сучасныя жанчыны не актыўна нараджаюць.**



Фота БелТА.

Як звярнуў увагу, адкрываючы пасяджэнне, **старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір КУХАРАЎ**, для паляпшэння сістэмы аховы здароўя прымаюцца сур'ёзныя меры. «Сістэмных праблем няма, але нам трэба зрабіць усё для таго, каб сістэма аховы здароўя горада працавала больш эфектыўна, забяспечвала рашэнні ўсіх задач па аказанні медыцынскіх паслуг, — канкрэтызаваў ён. — Усё для гэтага ў горадзе ёсць: прафесійныя супрацоўнікі, добрая матэрыяльна-тэхнічная база, прыняты арганізацыйныя пытанні. Сёння мы павінны забяспечыць дысцыпліну на працоўных месцах, прыняцце аператыўных своечасовых рашэнняў, адказныя адносіны з боку як кіраўнікоў, так і кожнага работніка сістэмы аховы здароўя».

За апошнюю пяцігодку ў Мінску ўведзена ў эксплуатацыю сем стацыянарных аб'ектаў, пабудаваны тры новыя паліклінікі, дзве амбулаторыі. Медыцынскія ўстановы рэгулярна мадэрнізуюцца. Толькі сёлета на мадэрнізацыю матэрыяльна-тэхнічнай базы, па словах **старшыні Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама Ігара ЮРКЕВІЧА**, было вылучана больш як 250 мільёнаў рублёў. Ен расказаў, што вырашаецца жыллёвае пытанне медработнікаў: будуюцца дамы, інтэрнаты. «Ідзе комплексная мадэрнізацыя сістэмы аховы здароўя, якая дазволіць істотна палепшыць якасць аказання медыцынскай дапамогі», — дадаў старшыня камітэта. — Увесь комплекс мерапрыемстваў накіраваны перш за ўсё на тое, каб кожны жыхар сталіцы мог атрымаць даступную, своечасовую медыцынскую дапамогу».

У размове з журналістамі **Старшыня Савета Рэспублікі Наталля КАЧАНАВА** рэзюмавала: нягледзячы на пытанні, якія яшчэ неабходна вырашаць, тое, што сёння робіцца ў Мінску з боку органаў улады, заслугоўвае адабрэння. «Праблемы і пытанні, якія ўзнікаюць у медыцынскай супольнасці горада, вырашаюцца вельмі аператыўна, — канкрэтызавала спікер. — Гэта і будаўніцтва, рэканструкцыя, мадэрнізацыя аб'ектаў аховы здароўя, гэта і набыццё медыцынскага абсталявання і лекавых сродкаў. Мы прайшлі разам ковід, і я бачыла, як горад сам дадаткова закупляў вакцыны, прэпараты для лячэння. Цяпер яны працуюць гэта жа. Усё, што сёння патрэбна для нармальнага функцыянавання сістэмы аховы здароўя ў Мінску, органы вырашаюць вельмі хутка».

Упаўнаважаны прадстаўнік кіраўніка дзяржавы ў горадзе Мінску пагаджаецца са старшынёй Камітэта па ахове здароўя Мінгарвыканкама, які адзначыў, што для эфектыўнай работы патрэбны добрыя адносіны медыцынскага персаналу да пацыентаў. «Не проста добрыя, а ўважлівыя адносіны, — удакладніла Наталля Качанава. — Усё для таго, каб вызначыць на больш ранніх стадыях захворванне — або анкалагічнае, або сістэмы кровазвароту — у горадзе ёсць. Ствараюцца скрынінгавыя цэнтры, іх эфектыўнасць сябе паказала. Будуць далей адкрывацца такія цэнтры, як і рэабілітацыйныя: рэабілітацыя таксама патрэбна людзям».

Кажучы аб замацаванні медыцынскіх кадраў у сталіцы, Старшыня Савета Рэспублікі перакананa: патрэбны стымулы. У якасці прыкладу яна прывяла інтэрнат на 1200 месцаў, які нядаўна пабудавалі. «Па сутнасці, гэта добраўпарадкаваныя маламетражныя кватэры, — канстатавала спікер. — Яшчэ будуецца інтэрнат. Павялічаны наборы ў медыцынскія каледжы для таго, каб больш спецыялістаў сярэдняга звяна прыходзіла працаваць ва ўстановы аховы здароўя».

Па словах Наталлі Качанавай, для таго, каб сістэма працавала эфектыўна, неабходна проста неабыякава ставіцца да людзей. «Трэба ўважліва арганізаваць работу кожнай установы, якая будзе накіравана на аказанне кваліфікаванай, якаснай медыцынскай дапамогі жыхарам Мінска і тым, хто апынуўся тут воляй лёсу».

**Вераніка КАНЮТА.**

# «ВА ЎЗАЕМАДЗЕЯННІ З ДЭПУТАТАМІ МОЖНА МНОГАЕ ЗРАБІЦЬ»

## У Мінскім аблвыканкаме з удзелам Ігара СЕРГЯЕНКІ абмеркавалі пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця рэгіёна

**Мінская вобласць застаецца найлепшай сярод абласцей Беларусі па дынаміцы сацыяльна-эканамічнага развіцця. Толькі за бягучую пяцігодку рэгіён уносіўся на Рэспубліканскую дошку Гонару двойчы — за дасягненні 2021 і 2023 гадоў — і мае ўсе шанцы зноў стаць найлепшым па выніках 2024 года. Пра гэта гаварылася ўчора на чарговым пасяджэнні Мінскага аблвыканкама, падчас якога разглядаліся пытанні сацыяльна-эканамічнага развіцця цэнтральнага рэгіёна на будучы год.**



Фота БелТА.

**Старшыня Мінскага аблвыканкама Аляксандр ТУРЧЫН**, нягледзячы на тое, што Мінская вобласць нядрэнна заканчвае бягучы год, лічыць, што падстаў для самазаспакаення няма: «Перад намі не менш адказная задача, наперадзе не менш складаны год». Але ўсе няпростыя задачы, па словах губернатара, выканальныя.

Аляксандр Турчын заўважыў, што кожны раён вобласці мае сваю спецыфіку эканамічнага развіцця, таму неабходна дыферэнцыяцыя лакальных задач. «Аднак ёсць і агульныя задачы, а менавіта — дабрабыт нашых людзей, наяўнасць работы, стан сацыяльнай сферы, жыллёва-камунальнай гаспадаркі. Гэта ўсё пытанні, якія ўплываюць на настрой нашых грамадзян. І нам на самай справе ёсць над чым працаваць. Шмат у гэтым плане робіцца, але яшчэ хапае таго, што не зроблена. Таму я проста яшчэ раз хачу сказаць, што мы павінны сёння кожны на сваіх месцах выконваць добрасумленна свае службовыя абавязкі. Калі мы гэта будзем рабіць, усё ў нас атрымаецца», — сказаў кіраўнік вобласці.

**Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, які прысутнічаў на пасяджэнні аблвыканкама, таксама настроіў прысутных на добрасумленную адказную працу: «Ад гэтага планавання будзе залежаць тое, як мы будзем жыць, працаваць і рухацца далей. Вядома, я шчыра радуюся поспехам Мінскай вобласці, і зразумела, што прагноз на наступны год грунтуецца на выніках адыходзячага года, на поспехах Міншчыны. І тое, што на наступны год амаль 60 працэнтаў бюджэту вобласці будзе запланавана на развіццё сацыяльнай сферы, — вельмі добра. Акрамя таго, у плане — павелічэнне на 10 працэнтаў выдаткаў на сістэму аховы здароўя, на 16 працэнтаў больш будзе накіравана на сацыяльную абарону і на 14 працэнтаў — на адукацыю. Гэта годны вынік, пра які не сорамна гаварыць нашым людзям».

У Палаце прадстаўнікоў наладжана практыка правядзення сустрэч у абласцях. Па словах Ігара Сергяенкі, галоўная мэта падобных сустрэч — давесці інфармацыю аб рабоце, якая праводзіцца дэпутатамі Палаты прадстаўнікоў, пачуць пытанні, заўвагі. Актыўны ўдзел прымаюць і дэпутаты, выбраныя ад Мінскай вобласці. «Ваш рэгіён прадстаўлены 17 дэпутатамі, і гэта самая вялікая дэпутацыя пасля горада Мінска», — заўважыў спікер Палаты прадстаўнікоў.

Ігар Сергяенка расказаў пра законапраекты, над якімі працавалі дэпутаты, і растлумачыў, што яшчэ адзін важны напрамак іх дзейнасці — вывучэнне грамадска-палітычнай сітуацыі на месцах. Сюды ўваходзіць маніторынг сацыяльнай сферы, сітуацыі ў гандлі, работы камісіі па садзейнічанні занятасці і іншае. «Гэтая работа не робіцца бяздумна. Важна знайсці не толькі праблему, але і яе рашэнне. Наша мэта — не звярнуць увагу на недахопы, якія заўсёды можна знайсці ў любой рабоце, а ўбачыць агульныя праблемы і арганізаваць работу па іх вырашэнні». Ён дадаў, што парламентарыі і дзяржаўныя служачыя павінны больш актыўна камунікаваць з моладдзю. У якасці станоўчага прыкладу сумеснай работы Ігар Сергяенка прывёў праект у Дзяржынскім раёне «Маленькі грамадзянін».

Работа са зваротамі грамадзян таксама на кантролі парламентарыяў. Старшыня Палаты прадстаўнікоў упэўнены, што ўсе пытанні трэба вырашаць на месцы. Мясцовыя органы ўлады могуць гэта зрабіць. «Дэпутацыя Мінскай вобласці актыўна ўцягнута ў работу. Старшыні райвыканкамаў павінны разумець, што гэта вашы памочнікі. І ва ўзаемадзеянні з імі можна многае зрабіць», — падагульніў Ігар Сергяенка.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў таксама павіншаваў Аляксандра Турчына з высокай узнагародай — ордэнам Айчыны III ступені.

А сам губернатар уручыў падзякі Прэзідэнта за плённую працу, высокі прафесіяналізм і асабісты ўклад у ліквідацыю наступстваў надзвычайных сітуацый прыроднага характару спецыялістам Міншчыны.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

Задача ад Першага

*„ Тэма для краіны — архіважная. Я ўжо сказаў: далей без навукі мы развіваць краіну не зможам. Усё, што мы маглі выціснуць інтэнсіўна і экстэнсіўна з таго, што ў нас ёсць у краіне, найперш у эканоміцы, мы ўжо зрабілі. Далей трэба развівацца, абапіраючыся на навуку. Без навукі нікуды. “*

*Аляксандр Лукашэнка падчас сустрэчы з рабочай групай па аналізе дзейнасці НАН Беларусі. 3 снежня 2024 года.*

# СПАРТЫЎНЫЯ ПОСПЕХІ — ГЭТА ТАКСАМА ПРАДУКТ

Без навукі нікуды і ў спорце. На гэта пастаянна звяртае ўвагу кіраўнік дзяржавы, падтрымлівае гэту думку і старшы трэнер нацыянальнай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ Уладзімір Шантаровіч. Разам з ім за навуку падрыхтоўкі спартсменаў і навуку перамагаць адказвае **Алена КАЛАУР, трэнер-урач нацыянальнай каманды, дацэнт кафедры тэорыі і методыкі фізічнага выхавання Мазырскага педагагічнага ўніверсітэта імя І. П. Шамякіна, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт.**

Падчас абмеркавання аналізу дзейнасці Акадэміі навук кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што без эфектыўнасці навукі нельга разлічваць на тое, што наша прадукцыя будзе запатрабавана на знешніх рынках. «Нашы спартыўныя поспехі — гэта таксама свайго роду прадукт, які мы прадстаўляем на міжнароднай арэне. А сцяг і гімн нашай краіны забяспечваюць яе імідж, — адзначыла Алена Калаур. — На прапанову плаціць вучоным такую ж зарплату, як і шахцёрам, Прэзідэнт заўважыў, што шахцёры накапалі і выдалі на-гара, вынік іх працы відаць. Людзі спорту таксама «капаюць» і «на-гара» выдаюць прадукт, якім можа ганарыцца ўся краіна».

Алена Калаур расказала, што ў нацыянальнай зборнай па веславанні на байдарках і каноэ навукова-метадычнае забеспячэнне падрыхтоўкі спартсменаў — прыярытэт. Яна растлумачыла, што спецыялістамі праводзіцца комплекс мерапрыемстваў, накіраваных на забеспячэнне эфектыўнасці падрыхтоўкі, захаванне здароўя спартсменаў і іх сацыяльную абарону: «Мы імкнёмся працаваць так, каб кожная трэніроўка была выніковай, паляпшала форму спартсмену і пры гэтым не прыносіла шкоды яго здароўю. Для гэтага пастаянна праводзіцца аналіз функцыянальных здольнасцяў спартсмена, штодзённа аналізуецца яго спецыяльная, агульнафізічная і псіхалагічная падрыхтоўка. Таму наша работа заснавана на стыку розных навук. Мы прымяняем методыкі і напрацоўкі педагогікі, медыцыны, фізікі, біялогіі, псіхалогіі. Фізіялогія і біяхімія знаходзяцца на вяршыні гэтай работы. Галоўнае патрабаванне да такога комплекснага падыходу — усе працэдуры павінны быць максімальна эфектыўнымі. Таксама гэта работа павінна мець максімальную прапускную здольнасць, то-бок, мы засяроджваемся не толькі на нацыянальнай камандзе, але ахопліваем і юніёрскі, і юнацкі састаў, нават удзяляем увагу групам пачатковай падрыхтоўкі, каб яны не пакутавалі ад няправільнай падрыхтоўкі. Асобна хачу падкрэсліць, што навуковая работа праводзіцца з кожным спартсменам індывідуальна і комплексна з камандай».

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# ПРАЦА Ў ДНК БЕЛАРУСАЎ

## Ад аграрыяў да работнікаў прамысловасці, нафтахімічнай і будаўнічай галін: дзяржузнагароды — найлепшым



Фота БелТА.

**Па даручэнні Прэзідэнта Беларусі прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА ўчора ўручыў 75 медалёў «За працоўныя заслугі». Заслужаныя дзяржаўныя ўзнагароды атрымалі тыя, чыя адданасць Радзіме і жаданне зрабіць яе лепшай па заслугах ацэнены кіраўніцтвам краіны. Прэм'ер-міністр падкрэсліў, што Беларусь — унікальная краіна з багатай гісторыяй і культурай, а кожны яе жыхар — часцінка вялікага цэлага:**

— Першая асацыяцыя з беларусамі, якая заўсёды прыходзіць у галаву, — працавітасць. І гэта не проста стэрэатып, а, напэўна, адна з базавых рыс нашага нацыянальнага характару. Можна сказаць, што праца ў ДНК беларусаў.

Раман Галоўчанка акцэнтаваў увагу на тым, што працавітасць з пакалення ў пакаленне перадаецца як вечная каштоўнасць, а таксама — на важнасць атрымання задавальнення ад вынікаў сваёй працы, сваіх намаганняў. А вымярэнняў для гэтага шмат: уласныя прафесійныя дасягненні, прызнанне з боку калег, дзяржавы.

Прэм'ер-міністр выказаў абсалютную ўпэўненасць у тым, што кожны з прысутных у зале сваімі дасягненнямі даказаў: беларусы здольныя шмат на што. Кожны з іх — гэта наглядны прыклад сумленных, па-здароваму амбіцыйных і настойлівых людзей.

— Чаму вы ў гэтай зале? — пацікавіўся Раман Галоўчанка і адказаў: — Таму што так вырашылі вашы кіраўнікі, працоўныя калектывы, якія вылучылі вас для атрымання гэтай высокай узнагароды. І, без сумневу, ваша гісторыя — гэта натхняльная гісторыя аб тым, як можна сваёй працай на сваім участку зрабіць краіну лепшай, прыгажэйшай і мацнейшай.

Са шчырымі словамі ў адказ ад усіх узнагароджаных выказалася начальнік Інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па горадзе Бабруйску Лілія Наронская:

— Не пабаюся сказаць, што дынамічнае развіццё нашай эканомікі, той узровень жыцця, які мы сёння маем, адукацыі і аховы здароўя, бяспекі — гэта дзякуючы сістэмнай, прафесійнай, прынцыповай пазіцыі кіраўніцтва нашай краіны, — падкрэсліла яна.

А таксама запэўніла, што ўсе, хто атрымаў высокія дзяржаўныя ўзнагароды, набылі новую матывацыю:

— Мы вернемся ў свае калектывы і з новай самааддачай, новымі сіламі будзем працаваць, ствараць, дасягаць новых мэт, вырашаць пастаўленыя задачы на карысць нашага народа і нашай краіны.

Раман Галоўчанка ў адказ на гэта заўважыў:

— Я абсалютна ўпэўнены, што нам па плячы многія вышыні. І чым больш будзе ў нас такіх людзей, як вы, чым лепш вы падрыхтуеце і выхаваеце змену, тым прасцей і больш упэўнена будзе жыць наступным пакаленням, якія прыйдуць за намі.

Прэм'ер-міністр выказаў упэўненасць, што ўсе прафесійныя дасягненні — гэта пачатак вялікага шляху:

— Вашы веды і вопыт будуць і ў далейшым служыць на карысць нашай краіны. Таму што вы — яе апора, яе будучыня. Вы, я ўпэўнены, будзеце настаўнікамі для маладзейшага пакалення і перададзіце ім усё найлепшае, што ёсць у вашай прафесійнай дзейнасці.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**

Дабрачыннасць

# ЗАДАЧА ДАРОСЛЫХ — ПАДАРЫЦЬ СВЯТА

## У рамках акцыі «Нашы дзеці» Бялыніцкую спецыяльную школу-інтэрнат наведаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Дзмітрый КРУТОЙ

**Радасна і ўрачыста сустрэлі ганаровых гасцей свята выхаванцы і выкладчыкі. У школе выхоўваецца 105 дзяцей з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця ва ўзросце ад 6 да 18 гадоў з усёй вобласці, у тым ліку 38 інвалідаў. Усе яны былі задзейнічаны ў навагоднім ранішніку, нават тыя, хто не выступаў на сцэне. Для дзяцей такія сустрэчы — заўсёды нагода для радасці. Разам з кіраўніком Адміністрацыі Прэзідэнта да іх завіталі старшыня Бялыніцкага райвыканкама Вольга ПРЫСТРОМСКАЯ, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама Алег СТЭЛЬМАШОК.**

Вясёлае казачнае прадстаўленне з Дзедам Марозам, Снягуркай, гарэзным гномам стала падарункам ганаровым гасцям. Дзеці чыталі вершы, разам з дарослымі вадзілі карагод.

— Дзякуй вам за такую цёплую сустрэчу, — звярнуўся да прысутных Дзмітрый Крутой. — Радасна бачыць вашы шчаслівыя твары. Вы доўга рыхтаваліся, шмат рэпеціравалі, але ўсё роўна глядзіце прадстаўленне як першы раз. Гэта асаблівасць дзяцей, якія чакаюць Новы год больш за ўсё. І задача дарослых — падарыць свята. Мне асабіста прыемна, што сустрэча адбылася на маёй радзіме, куды я заўсёды з задавальненнем прыязджаю.

У якасці падарункаў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта перадаў дзецям пакеты з цукеркамі, а школе-інтэрнату — сертыфікаты на трактар Беларус-422.1 (падарунак дарэчы — школа-інтэрнат таксама спецыялізуецца на вырошчванні гародніны) з абсталяваннем і мультыборд.

**— Гэтыя падарункі зроблены з мэтай, каб установе было лягчэй спраўляцца са сваімі задачамі. Мы стараемся ўлічваць пажаданні тых устаноў, якія наведваем, — падкрэсліў у размове з журналістамі Дзмітрый Крутой. — Наогул, акцыя «Нашы дзеці» — цудоўная традыцыя. Старт ёй быў дадзены ў 1995 годзе, налета ўжо будзе юбілей.**

Пачыналася яна не так маштабна, першаступенная задачай было павіншаваць уразлівую катэгорыю дзяцей, потым далучыліся адораныя дзеці, пераможцы алімпіяд, спартыўных спаборніцтваў, цяпер задзейнічаныя ўсе дзеткі нашай краіны. Дзяржаўныя органы, арганізацыі рыхтуюцца загадзя, і яшчэ ў верасні прапрацоўваюцца спісы ўстаноў, школ, якія будуць наведваць. Кожны хоча чымсьці выдзяліцца і парадаваць дзетак па-свойму.

**Цудоўна, што колькасць уцягнутых у гэтую акцыю людзей павялічваецца. І тая задача, якую паставіў Прэзідэнт, — дайсці да кожнага дзіцяці, безумоўна, выконваецца.**



— Трактар для нас — вельмі неабходная рэч, — радуецца **дырэктар Бялыніцкай спецыяльнай школы-інтэрната Аляксандр МАМЧАНКА**. — Сёлета накапалі 18 тон бульбы. Нам дапамаглі сабраць ураджай шэфы ад пагранкамітэта і курсанты інстытута пагранічных войск. Працавалі весела — з паходнай кухняй, музыкай. Сабралі бульбу за дзень. Цяпер з дапамогай трактара часу спатрэбіцца менш. Уся плодаагародніння прадукцыя ідзе на наш харчаблок і выкарыстоўваецца на ўласныя патрэбы.

Акрамя інтэрактыўнай дошкі і трактара, школа-інтэрнат атрымала планетарны міксер для харчаблока, з дапамогай якога можна будзе рабіць цеста і ўзбіваць бялковыя крэмы. А таксама працірачна-рэзальную машыну.

Новы год — шчодрае свята. І не толькі для дзяцей.

— У рамках акцый «Нашы дзеці» і «Ад усёй душы» мы хочам падарыць часцінку дабра, святла і дзецям, і дарослым, — адзначыла старшыня Бялыніцкага райвыканкама Вольга Прыстромская. — Традыцыйна віншуем з Новым годам дзетак нашай спецыяльнай школы-інтэрната. Яны чакаюць гэтага свята, заўсёды рыхтуюцца. Не забываем і пра грамадзян сталага веку, адзінокіх, тых, хто трапіў у бальніцу. Галоўнае — удзяліць увагу кожнаму.

**Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара.**

*г. Бялынічы.*

# Атуліць клопатам і ўвагай

## У Беларусі стартуе навагодняя акцыя «Ад усёй душы»

**З 26 снежня ва ўсіх рэгіёнах краіны пачнецца рэспубліканская навагодняя дабрачынная акцыя «Ад усёй душы». У Беларусі яна пройдзе ўжо трэці раз. Летась яна ахапіла каля 330 тысяч пажылых людзей, а ўдзел у дабрачыннай ініцыятыве прыняло каля 80 тысяч маладых людзей. Сёлета акцыя абяцае стаць не менш маштабнай.**

### ВЕТЭРАНЫ, ДОЎГАЖЫХАРЫ, АДЗІНОКІЯ ГРАМАДЗЯНЕ

**Намеснік міністра працы і сацыяльнай абароны Марына АРЦЁМЕНКА** нагадала, што акцыя стала праходзіць па ініцыятыве Прэзідэнта. «Яе галоўная задача — атуліць клопатам і ўвагай нашых пажылых грамадзян напярэдадні такіх светлых свят, як Новы год і Каляды. Гэтая акцыя з'яўляецца працягам акцыі «Нашы дзеці», і галоўны яе пасыл, сфармуляваны кіраўніком дзяржавы, заключаецца ў тым, што спачатку мы ідзём да дзяцей, а затым дзеці ідуць да нашых пажылых. Стаўленне да дзяцей і людзей сталага веку з'яўляецца сацыяльным індыкатарам здароўя грамадства і яго маральнага дабрабыту. Таму асноўны канцэпт акцыі заключаецца ў тым, каб праявіць гэты клопат з боку нашага маладога пакалення і максімальна ўцягнуць у пытанні аказання дапамогі старэйшаму пакаленню. Чырвоный ніткай праз усю акцыю праходзіць значнасць развіцця сувязі паміж пакаленнямі», — адзначыла Марына Арцёменка.

**У Беларусі жыве больш за 1,5 мільёна людзей ва ўзросце, старэйшым за 65 гадоў. У рамках акцыі акцэнт будзе зроблены на пажылых адзінокіх грамадзянах, якіх у краіне больш за 120 тысяч. Акрамя таго, пад асаблівай увагай будуць людзі, якія жывуць у сацыяльных установах (іх каля 20 тысяч), а таксама доўгажыхары, якім 90 і больш гадоў — у краіне іх звыш 40 тысяч, у тым ліку 613 чалавек, старэйшых за 100 гадоў. Безумоўна, без увагі не застануцца ветэраны Вялікай Айчыннай вайны (іх 961 чалавек), былыя вязні фашызму і тыя грамадзяне, якія ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны знаходзіліся ў непаўналетнім узросце (іх амаль 500 тысяч), ветэраны працы.**

### КАНЦЭРТЫ І КАЛЯДНЫЯ БАЛІ

Акцыя праходзіць у два этапы. Першы — падрыхтоўка да свят: упрыгожванне дамоў пажылых людзей, сацыяльных установ, выраб сувеніраў і навядзенне парадку. Другі этап — віншавальны, у рамках якога пройдуць адзіныя святочныя мерапрыемствы. Будзе пяць такіх адзіных тэматычных дзён.

Першы адкрые саму акцыю 26 снежня ва ўсіх рэгіёнах краіны. Адкрыццё пройдзе ў абласных гарадах і Мінску. А вось 30 снежня пройдзе «Гірлянда добрых спраў». Малады людзі навядуць парадак і дапамогуць упрыгожыць ёлку людзям сталага веку. Плануецца, што ў гэтым мерапрыемстве прыме ўдзел амаль 80 тысяч чалавек.

На вечар «Віншуем ад усёй душы», арганізаваны Міністэрствам культуры і Міністэрствам працы і сацыяльнай абароны, на балет "Шчаўкунчык" Вялікі тэатр запросіць 3 студзеня каля тысячы пажылых людзей, пераважна з Мінска і Мінскай вобласці. Адзіны дзень правядзення калядных баляў для пажылых грамадзян пад назвай «Калядная сімфонія» адбудзецца 8 студзеня. Балі пройдуць на розных лакацыях, напрыклад, у Брэсцкай вобласці — у гісторыка-мемарыяльным музеі «Сядзіба Нямцэвічаў», а ў Гродзенскай вобласці — у Палацы Друцкіх-Любецкіх у Шчучыне.

Завяршыцца акцыя 14 студзеня адзіным тэматычным днём «Сустрэнем дружна Стары Новы год!» Сярэбраныя валанцёры разам з моладдзю прыйдуць павіншаваць грамадзян пажылога ўзросту і адзінокіх людзей.

У дні акцыі юбілеі адсвяткуюць больш за 800 доўгажыхароў, а дзень нараджэння адзначаць каля дзвюх тысяч чалавек з тых, каму споўнілася 90 гадоў і больш. Іх павіншуюць з удзелам мясцовых органаў улады, устаноў адукацыі і грамадскіх аб'яднанняў.

Марына Арцёменка адзначыла, што адна з задач акцыі — замацаванне шэфскіх арганізацый, прадпрыемстваў і ўстаноў адукацыі не толькі на перыяд акцыі, але і на будучыню.

Як паведаміла **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ**, да акцыі далучацца ўстановы адукацыі. Ва ўсіх іх дзейнічаюць валанцёрскія атрады, а валанцёрскім рухам ахоплена каля 70 тысяч чалавек.

**Алена КРАВЕЦ.**

# СВОЕЧАСОВА І ПА РАХУНКАХ

## ТРАДЫЦЫЙНАЯ ПРАКТЫКА

Напачатку адзначым, што па традыцыі змены ў падатковым заканадаўстве ўносяцца штогод. І гэта звязана з неабходнасцю прывядзення Падатковага кодэкса ў адпаведнасць з заканадаўчымі актамі, якія былі прынятыя на працягу года. Таксама неабходна адаптаваць стаўкі падаткаў да інфляцыйных і іншых працэсаў, якія адбываюцца ў краіне. Акрамя таго, дэталёва аналізуецца эфектыўнасць прымянення стымуляцыйных мер, якія дзейнічалі доўгі час. І падатковая палітыка на наступны 2025 фінансавы год будзе накіравана на забеспячэнне ўстойлівага бюджэту для выканання прадугледжаных расходных абавязацельстваў.

## У НАГУ З ЭКАНОМІКАЙ

Дык што ж зменіцца? Па-першае, прадугледжана індэксацыя падатковых ставак, устаноўленых у беларускіх рублях, на прагнозны параметр інфляцыі. Будуць праіндэксаваны стаўкі зямельнага падатку, падатку на нерухомую маёмасць, экалагічнага падатку, падаходнага падатку з фізічных асоб у фіксаваных сумах. Адначасова індэксуюцца вылікі і льготы па падаходным падатку — тут індэксацыя адбываецца на тэмп росту намінальнай заработнай платы.

— На 11,9 працэнта прапануецца павялічыць стаўкі акцызаў на цыгарэты першай цэнавай групы. Астатнія стаўкі акцызаў на тытунь і алкаголь будуць праіндэксаваны ў межах параметраў інфляцыі, — паведаміў **першы намеснік міністра фінансаў Дзмітрый КІЙКО.** — Стаўкі акцызаў на аўтамабільнае паліва прапануецца захаваць без індэксацыі. У якасці новага аб'екта падаткаабкладання акцызамі будуць безалкагольныя энергетычныя напіткі. Стаўка складзе 50 капеек за літр гатовай прадукцыі. Мера прапанавана ў рамках паэтапнага пашырэння падакцызнай прадукцыі. Яе ўступленне ў сілу прадугледжана з 1 студзеня 2026 года, каб плацельшчыкі змаглі адаптавацца да змен.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Яшчэ адна навіна датычыцца замацавання на пастаянным аснове або прадаўжэння тэрміну дзеяння мер падатковай палітыкі па бюджэтнай кансалідацыі, якія былі прыняты ў папярэднія гады. Нагадаем, такія меры прымаліся для адаптацыі эканомікі ва ўмовах пандэміі і санкцыйнай палітыкі Захаду.

— У прыватнасці, будзе працягваць дзейнічаць павялічаная стаўка падатку на прыбытак да 25 працэнтаў пры перавышэнні падаткаабкладальнай базы 25 млн рублёў. Гэта так званы «падатак на звышдаходы», і ён закранае тых беларусаў, якія зарабляюць звыш названага крытэрыю, для ўсіх астатніх стаўка захоўваецца на ўзроўні 13 працэнтаў, — дадаў першы намеснік міністра фінансаў.

